*Спорт* *Спорт*

# ПАМЯЦІ А. СТЭМПКОЎСКАЙ

Імя адважнай радысткі Героя Савецкага Саюза Алены Стэмпкоўскай асабліва дорага для працоўных горада і раёна: яна нарадзілася на Салігоршчыне. Кароткім было жыццё слаўнай дачкі Ленінскага камсамола. 18-гадовай дзяўчынай у чэрвені 1941 года яна добраахвотна пайшла ў дзеючую армію.

Там Алена стала радысткай, жорстка помсціла фашыстам за здзекі над савецкімі людзьмі. Летам 1942 года ў адным з баёў у данскім хутары Зімавенькі Алена, страціўшы сваіх таварышаў, працягвала касіць наступаючых ворагаў кулямётнымі чэргамі. У гэтым баі адважная патрыётка загінула.

За мужнасць і адвагу Алене Стэмпкоўскай пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Прайшлі гады. Не сцёрся ў людской памяці подзвіг камсамолкі. Працоўныя Салігоршчыны будуць заўсёды помніць аб ёй.

У мінулую нядзелю па ініцыятыве гаркома камсамола і горсавета саюза спартыўных таварыстваў і арганізацый быў праведзен лыжны крос, прысвечаны памяці Алены Стэмпкоўскай. На месца спаборніцтва ў раён бальнічнага гарадка прыбыло 10 каманд калектываў фізкультуры горада. На лыжню выйшла каля 120 спартсменаў.

Жанчыны памераліся сіламі на пяцікіламетровай дыстанцыі, мужчыны — на 10 і 15-кіламетровай. У камандным заліку перамаглі лыжнікі гарадскога прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 69. Яны і заваявалі пераходны кубак. Спартсмены першай сярэдняй школы занялі другое месца, апярэдзіўшы сваіх сапернікаў з другой школы.

У асабістым заліку сярод жанчын лепшыя вынікі паказалі Н. Стагмачова з Другога калійнага камбіната, Святлана Брыкнер і Вера Занчына (Першы калійны). У мужчын у гонцы на 10 кіламетраў першым фінішыраваў прадстаўнік уладальнікаў кубка М. Кішкурно, другім — яго таварыш па камандзе М. Хроль, трэцім быў навучэнец 9-га класа другой Салігорскай сярэдняй школы Аляксандр Цвірко. На 15-кіламетровай дыстанцыі гонку выйгралі Леанід Баброў і Мікалай Шыпулін (Першы калійны) і спартсмен з Другога калійнага Леанід Сапешка.

Нягледзячы на адлігу, спартсмены паказалі высокае майстэрства, гарачае жаданне перамагчы. Спаборніцтвы, прысвечаныя памяці Алены Стэмпкоўскай, вырашана праводзіць кожны год.

**А. ЛІХАЛАП,**
**старшыня гарсавета саюза спартыўных таварыстваў і арганізацый.**